Падтрымай "Вясну" на PATREON

Жлобін: палітвязняў, якія адбываюць пакаранне, ізноў асудзілі. На гэты раз за абразу дзяржаўных сімвалаў

21.10.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, палітвязні, дыфамацыя



Ілля Патрушаў і Віктар Шмігельскі

У судзе Жлобінскага раёна 21 кастрычніка вынесены прысуд па крымінальнай справе за абразу дзяржаўных сімвалаў (арт. 370 КК РБ). На лаве падсудных - двое мясцовых жыхароў: палітвязні Ілля Патрушаў і Віктар Шмігельскі.

Справу разглядала суддзя **Наталля Качалава**, дзяржабвінаваўца – пракурор **Сямён Фядорчанка.**

Яшчэ 3 жніўня 2021 года стала вядома, што з месца адбыцця папярэдняга пакарання абвінавачаных перавялі ў СІЗА-3 горада Гомеля.



Па два з паловай гады гады калоніі прысудзіў суд актыўным удзельнікам акцыі пратэсту ў Жлобіне

10 жніўня вечарам ў Жлобіне маладыя людзі сталі ў счэпку і разам з іншымі нанеслі удары па шчытах супрацоўнікаў міліцыі, а таксама кінулі камяні ў іх бок.

Беларускай праваабарончай супольнасцю Ілля Патрушаў і Віктар Шмігельскі былі прызнаныя палітзняволенымі.

Згодна з матэрыяламі абвінавачвання, у верасні 2020 года, уначы, знаходзячыся ў стане алкагольнага ап'янення, Ілля Патрушаў і Віктар Шмігельскі разам з неўстаноўленымі асобамі знаходзіліся каля Жлобінскага аддзялення РУПП "Белпошта". Заўважылі на будынку дзяржаўны сцяг.

Патрушаў ускочыў на аконны выступ і садраў палотнішча разам з дрэўкам. Затым яны зайшлі ў бліжэйшы двор на вуліцы Першамайскай і *"працягвалі абразлівыя дзеянні ў дачыненні да дзяржаўнага сімвала*": спрабавалі спачатку яго парваць, затым спаліць з дапамогай запальнічкі. Калі гэта не атрымалася – пачалі таптаць палотнішча а потым "здзейснілі на сцяг мочаспусканне".

Пры гэтых дзеяннях абвінавачаных прысутнічалі сведкі.

Частка з іх ў суд не з'явілася, астатнія блыталіся ў паказаннях, спасылаліся на тое, што прайшло шмат часу ад моманту здзяйснення злачынства.

Абвінавачаныя аформілі "яўку з павіннай" і прызналі сваю віну.

Абвінавачванне таксама заявіла пра матэрыяльны зыск у памеры 90 рублёў за сапсаваны сцяг.

Суд прызнаў іх вінаватымі і прызначыў пакаранне: **абмежаванне волі з накіраваннем ва ўстановы адкрытага тыпу тэрмінам на адзін год кожнага.**

Па сукупнасці пакаранняў, шляхам частковага іх складання, канчаткова прызначыць Іллю Патрушаву і Віктару Шмігельскаму **пазбаўленне волі ў калоніі агульнага рэжыму тэрмінам на два гады і восем месяцаў.** Такім чынам, да ранейшага пакарання дадалося яшчэ два месяцы калоніі.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску





АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі" – акцыя вясноўцаў у Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Грамадзяніна Польшчы асудзілі ў Беларусі за "агентурную дзейнасць"

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў



рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY